Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Нацыянальны інстытут адукацыі

# БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ: ФАРМІРАВАННЕ ІНДУСТРЫЯЛЬНАГА ГРАМАДСТВА І НАЦЫІ (канец XVIII — пачатак XX ст.)

## Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў па гісторыі Беларусі для вучняў IX класа агульнаадукацыйных устаноў

*Аўтар-складальнік: А. А. Корзюк*

Мінск 2009

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

*Актуальнасць* правядзення факультатыўных заняткаў абумоўлена мэтазгоднасцю дасягнення якасці гістарычнай адукацыі праз засваенне вучнямі IX класса змястоўнага і дзейнаснага кампанентаў вучэбных гістарычных ведаў аб грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі і сацыялізацыі асобы праз фарміраванне ў дзевяцікласнікаў якасцей, якія неабходны для выканання сацыяльных функцый, абумоўленых агульнапрынятай ў сучасным беларускім грамадстве сістэмай каштоўнасцей.

*Мэта* правядзення факультатыўных заняткаў заключаюцца ў авалоданні вучнямі асновамі сістэматызаваных ведаў аб падзеях, з’явах, працэсах, тэндэнцыях у гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст., пададзеных рэпрэзентатыўна ў форме адпаведных дакументаў, матэрыялаў крыніцазнаўчага характару і літаратурных вобразах у іх узаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці.

Зыходзячы з мэты факультатыва, яго *задачамі* з’уляюцца наступныя:

– сістэматызацыя і абагульненне тэарэтычнага, факталагічнага і ацэначнага кампанентаў вучэбных гістарычных ведаў аб гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст.;

– асэнсаванне вучнямі асноўных тэндэнцый развіцця беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі і фарміраванне на гэтай падставе інтэлектуальных якасцей асобы, неабходных для аналізу сацыяльнай рэчаіснасці;

– стварэнне ўмоў для фарміравання грамадзянскага патрыятызма і нацыянальнай самасвядомасці школьнікаў, пачуцця гонару за культурна-гістарычныя дасягненні беларускага народа.

Вучэбнай праграмай прадугледжваецца фарміраванне ў дзевяцікласнікаў *дзейнаснага кампаненту* гістарычнай адукацыі, які прадстаўлены пералікам уменняў: суадносіць адпаведныя з’явы і працэсы айчыннай і сусветнай



Образовательный портал www.adu.by / Национальный институт образования

гісторыі канца XVIII – пачатку XX ст., у прыватнасці расійскай і агульнаеўрапейскай, на падставе пісьмовых гістарычных крыніц рознага характару; характарызаваць сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае становішча Беларусі; ацэньваць вынікі дзейнасці гістарычных асоб і дзеячаў культуры; тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж падзеямі, з’явамі і працэсамі; канкрэтызаваць тэарэтычныя высновы і паняцці з дапамогай дакументаў і матэрыялаў; тлумачыць розныя пункты гледжання на гістарычныя падзеі, прадстаўленыя ў дакументах. Комплекс пералічаных спосабаў дзейнасці складае дзейнасны кампанент гістарычнай адукацыі, які рэалізуецца ў працэсе арганізацыі вучэбнай працы з дакументальнымі гістарычнымі матэрыяламі, што ў рознай ступені рэпрэзентатыўнасці адлюстроўваюць заканамернасці і асаблівасці развіцця беларускага грамадства ў адзначаны перыяд. Пералічаныя спосабы вучэбна-пазнавальнай дзейнасці фарміруюцца праз арганізацыю працы вучняў з метадычным апаратам да тэкстаў дакументаў і матэрыялаў, які ўяўляе сабой комплекс рознаўзроўневых пытанняў і заданняў, у тым ліку пошуковага характару.

Дакументальныя матэрыялы і фрагменты мастацкіх твораў, якія прадугледжваецца выкарыстоўваць у працэсе арганізацыі факультатыўных заняткаў, уяўляюць сабой іх *змястоўны кампанент*. Яны ахопліваюць падзеі грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця беларускага народа ў канцы XVIII – пачатку XX ст., працэс паступовага станаўлення індустрыяльнага грамадства, з’явы культурнага жыцця, умовы і асаблівасці фарміравання беларускай нацыі і тэндэнцыі яе развіцця ў пачатку XX ст. Дакументальныя матэрыялы, якія размешчаны ў выданнях, прадстаўленых у спісе рэкамендуемай літаратуры, маюць шматпланавы характар, што дазваляе азнаёміцца і прааналізаваць розныя бакі жыцця насельніцтва беларускіх зямель. Частку крыніц складаюць афіцыйныя заканадаўчыя і статыстычныя матэрыялы (указы і пастановы расійскага ўрада і ўрадавых устаноў, матэрыялы перыядычнага друку). Другая частка прадстаўлена матэрыяламі эпісталярнага жанру, якія маюць асобасны характар (успаміны,


Образовательный портал www.adu.by / Национальный институт образования

мемуары, пісьмы, звароты і інш.). Акрамя дакументальных матэрыялаў, у ходзе факультатыўных заняткаў прапануецца выкарыстоўваць фрагменты мастацкіх твораў, якія датычацца розных бакоў гісторыі беларускага народа ў канцы XVIII – пачатку XX ст., створаных як сучаснікамі вывучаемых падзей, так і ў больш позні перыяд. Выкарыстанне літаратурных помнікаў эпохі дапаможа вучням атрымаць цэласнае ўяўленне аб стварэнні і развіцці новай беларускай літаратуры, адлюстраванні ў яе творах сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных працэсаў, якія мелі месца на беларускіх землях. Зварот да мастацкіх твораў, прысвечаных асобным гістарычнам падзеям разглядаемага перыяду, будзе спрыяць іх вобразнаму асэнсаванню, а таксама ўстанаўленню міжпрадметных сувязяў са зместам курса беларускай літаратуры.

Пры арганізацыі факультатыўных заняткаў варта ўлічваць, што гісторыя Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. можа вывучацца на розных узроўнях: як частка расійскай гісторыі, г. зн. у кантэксце сусветнай, а таксама на краязнаўчым узроўні, што прадугледжвае ўвядзенне ў зварот часткі дакументальных матэрыялаў мясцовага характару.

Дакументальныя матэрыялы і адпаведны метадычны апарат, прадстаўленыя ў дыдактычных матэрыялах і метадычных рэкамендацыях, на факультатыўных занятках рэкамендуецца выкарыстоўваць паслядоўна ў адпаведнасці з лінейным прынцыпам праходжання вучэбнага матэрыялу па адпаведных гістарычных перыядах і тэмах. Форма правядзення факультатыўных заняткаў прадугледжвае арганізацыю самастойнай практыка-арыентаванай дзейнасці дзевяцікласнікаў па засваенні адпаведнага зместу праз фарміраванне ўменняў, звязаных з арыентацыяй у вучэбным інфармацыйным асяроддзі. На аснове атрыманых на ўроках гісторыі Беларусі ведаў вучні самастойна рашаюць пазнавальныя задачы, выконваюць праблемныя заданні, праводзяць даследаванне, прадстаўляюць вынікі сваёй індывідуальнай ці калектыўнай дзейнасці. Сярод рэкамендуемых форм правядзення факультатыва можна адзначыць лабараторныя, практычныя

заняткі, семінары, дыскусіі, распрацоўку праектаў з выкарыстаннем комплексу гістарычных крыніц.

На правядзенне факультатыва прадугледжваецца 35 вучэбных гадзін (у тым ліку 3 гадзіны – рэзервовы час) – па адной вучэбнай гадзіне на тыдзень пры вывучэнні гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. на працягу вучэбнага года ці дзве вучэбныя гадзіны на тыдзень пры праходжанні адпаведнага вучэбнага матэрыялу толькі ў другім паўгоддзі вучэбнага года.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Раздзел І. Беларусь на зыходзе феадалізму: канец XVIII – сярэдзіна XIX ст. (12 гадз.)

**Беларускія землі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст.** Вызначэнне змен у грамадска-палітычным уладкаванні беларускіх зямель пасля іх далучэння да Расійскай імперыі. Характарыстыка сацыяльна-эканамічнай палітыкі царскага ўрада ў дачыненні да насельніцтва Беларусі.

**Беларусь у вайне 1812 г.** Характарыстыка баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі. Вызначэнне адносін розных сацыяльных груп да вайны. Аналіз становішча насельніцтва ў час вайны і яе вынікаў для Беларусі.

**Грамадска-палітычны рух на беларускіх землях у першай трэці XIX ст.** Вызначэнне мэт і складу ўдзельнікаў тайных арганізацый і таварыстваў на беларускіх землях. Характарыстыка іх дзейнасці.

**Паўстанне 1830–1831 гг. на беларускіх землях.** Аналіз прычын, ходу і вынікаў польскага паўстання 1830–1831 гг. на беларускіх землях. Вызначэнне сацыяльнага складу яго ўдзельнікаў і прычын паражэння.

**Палітыка царскага ўрада ў беларускіх губернях у 1830–1840-я гг.** Вызначэнне накірункаў палітыкі расійскага ўрада ў Беларусі пасля паўстання 1831 г. Характарыстыка мерапрыемстваў самадзяржаўя, накіраваных на падрыў пазіцый шляхты.

**Канфесійнае становішча ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.** Параўнальны аналіз стану асноўных хрысціянскіх канфесій Беларусі пасля далучэння да Расіі. Вызначэнне прычын ліквідацыі уніяцкай царквы.

**Развіццё сельскай гаспадаркі ў першай палове XIX ст.** Характарыстыка гаспадарчага развіцця вёскі. Вызначэнне сацыяльна-прававога становішча сялян.

**Спробы рэфарміравання сельскай гаспадаркі ў першай палове XIX ст.** Вылучэнне і аналіз асноўных накірункаў рэформы П. Кісялёва ў

дзяржаўнай вёсцы. Вызначэнне прычын крызісу феадальна-прыгонніцкага ладу.

**Развіццё прамысловасці і гандлю ў першай палове XIX ст.** Параўнальная характарыстыка форм прамысловай вытворчасці. Вызначэнне ролі кірмашоў у развіцці гандлю. Аналіз структуры экспарту-імпарту беларускіх зямель.

**Стан адукацыі ў першай палове XIX ст.** Вылучэнне асноўных тэндэнцый у развіцці адукацыі на беларускіх землях. Характарыстыка навучальных устаноў розных тыпаў.

**Навука ў першай палове XIX ст.** Раскрыццё сутнасці працэсу станаўлення навуковых ведаў у Беларусі. Характарыстыка асноўных дасягненняў беларусазнаўства першай паловы XIX ст.

**Развіццё літаратуры і мастацтва ў першай палове XIX ст.** Характарыстыка дзейнасці і ацэнка ўкладу ў развіццё беларускай літаратуры Я. Баршчэўскага, П. Багрыма, В. Дуніна-Марцінкевіча. Вызначэнне галоўных рыс развіцця архітэктуры і тэатральнага мастацтва.

## Раздзел II. Усталяванне капіталізму на беларускіх землях: другая палова XIX – пачатак XX ст. (19 гадз.)

**Адмена прыгоннага права. Правядзенне буржуазных рэформ.** Вызначэнне прычын і сутнасці сялянскай рэформы 1861 г. Аналіз і тлумачэнне прычын сялянскіх выступленняў у адказ на рэформу. Раскрыццё характару буржуазных рэформ 60–70-х гг. XIX ст.

**Развіццё капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы.** Раскрыццё асаблівасцей развіцця капіталізму ў беларускай вёсцы пароформеннага перыяду. Характарыстыка спецыялізацыі сельскай гаспадаркі. Параўнальны аналіз прадпрымальніцкай гаспадаркі памешчыка і сялянскай гаспадаркі.

**Развіццё капіталізму ў прамысловасці Беларусі ў 1860-я гг. – пачатку XX ст. Стан гарадоў.** Характарыстыка прамысловага перавароту і

вызначэнне яго асаблівасцей на Беларусі. Раскрыццё працэсу станаўлення фабрычнай вытворчасці. Вызначэнне змен у стане гарадоў і складзе гарадскога насельніцтва.

**Стан гандлю і транспарту ў 1860-я гг. – пачатку XX ст.** Характарыстыка шляхоў зносін і стану гандлю. Вызначэнне ролі чыгунак у гандлёва-эканамічным развіцці беларускіх зямель.

**Сацыяльныя супярэчнасці ў вёсцы і горадзе.** Характарыстыка ўмоў жыцця і працы рабочых і сялян. Вылучэнне прычын сялянскага і рабочага руху. Вызначэнне і характарыстыка асноўных форм барацьбы працоўных.

**Паўстанне 1863–1864 гг. у Беларусі.** Вызначэнне прычын і характару паўстання. Характарыстыка асобы і поглядаў К. Каліноўскага. Вызначэнне ўплыву паўстання 1863–1864 гг. на ўмовы вызвалення сялян беларускіх губерняў.

**Палітыка самадзяржаўя ў Беларусі ў апошняй трэці XIX ст.** Аналіз сітуацыі ў беларускіх губернях пасля паўстання 1863–1864 гг. Вызначэнне асноўных накірункаў палітыкі расійскага ўрада ў нацыянальна-рэлігійным і культурным жыцці і іх ацэнка. Характарыстыка заходнерусізму.

**Утварэнне палітычных партый і рухаў.** Характарыстыка дзейнасці рэвалюцыйных народнікаў. Раскрыццё сутнасці праграмы групы “Гоман”. Дзейнасць агульнарасійскіх сацыял-дэмакратычных арганізацый у Беларусі. Аналіз праграмных патрабаванняў Беларускай сацыялістычнай грамады і іх ацэнка.

**Падзеі рэвалюцыі 1905–1907 гг. у Беларусі.** Раскрыццё ходу рэвалюцыйных падзей на тэрыторыі Беларусі. Вызначэнне і характарыстыка асноўных патрабаванняў і форм барацьбы сялян, рабочых і салдат. Аналіз палажэнняў Маніфеста 17 кастрычніка і вызначэнне яго ўплыву на дзейнасць палітычных партый і рухаў.

**Грамадска-палітычны рух у Беларусі ў 1906–1914 гг.** Параўнальны аналіз пазіцый сацыял-дэмакратычных і беларускіх нацыянальных


Образовательный портал www.adu.by / Национальный институт образования

арганізацый. Раскрыццё ролі газеты “Наша ніва” у афармленні і развіцці беларускага нацыянальнага руху.

**Рэформы П. А. Сталыпіна ў Беларусі.** Вылучэнне мэт і асноўных накірункаў аграрнай рэформы. Вызначэнне сутнасці земскай рэформы і асаблівасцей яе правядзення ў Беларусі.

**Становішча Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны.** Характарыстыка настрояў у беларускім грамадстве, выкліканых пачаткам ваенных дзеянняў. Раскрыццё сутнасці германскага акупацыйнага рэжыму ў Заходняй Беларусі.

**Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. ў Беларусі.** Характарыстыка крызісных з’яў у грамадстве. Вызначэнне прычын і ўмоў звяржэння самадзяржаўя. Рэвалюцыйныя падзеі на беларускіх землях.

**Палітычная сітуацыя ў Беларусі вясной – летам 1917 г. і яе абвастрэнне.** Вывучэнне працэсу размежавання палітычных сіл пасля Лютаўскай рэвалюцыі. Характарыстыка дзейнасці беларускага нацыянальнага руху.

**Фарміраванне беларускай нацыі.** Вылучэнне і характарыстыка прыкмет беларускай нацыі. Вызначэнне і аналіз умоў і асаблівасцей яе фарміравання. Раскрыццё ролі газеты “Наша ніва” у нацыятворчым працэсе.

**Развіццё адукацыі і навукі ў 1860-я гг. – пачатку XX ст.** Характарыстыка стану пачатковай і сярэдняй адукацыі на беларускіх землях. Вызначэнне цяжкасцей і перашкод у развіцці адукацыі і навукі. Характарыстыка асноўных дасягненняў беларусазнаўства другой паловы XIX – пачатку XX ст.

**Нацыянальная літаратура у 1860-я гг. – пачатку XX ст.** Вызначэнне ўмоў развіцця беларускай літаратуры. Вылучэнне асноўных напрамкаў творчасці Ф. Багушэвіча, Цёткі, Янкі Купалы, Якуба Коласа, М. Багдановіча і тлумачэнне іх укладу ў нацыянальную культуру.



Образовательный портал www.adu.by / Национальный институт образования

**Станаўленне беларускага тэатра.** Вызначэнне асаблівасцяў зараджэння беларускага прафесійнага тэатра. Характарыстыка асобы І. Буйніцкага і яго ролі ў развіцці тэатральнага мастацтва.

**Развіццё мастацтва.** Характарыстыка творчай дзейнасці майстроў жывапісу. Вызначэнне новых рыс у развіцці архітэктуры і горадабудаўніцтва.

**Выніковае абагульненне** (1 гадз.)

## ЧАКАЕМЫЯ ВЫНІКІ ФАКУЛЬТАТЫЎНЫХ ЗАНЯТКАЎ

У выніку правядзення факультатыўных заняткаў вучні павінны авалодаць наступнымі спосабамі дзейнасці:

– называць храналагічныя рамкі гістарычных падзей, з’яў, працэсаў, вызначаць у іх асобныя этапы і перыяды;

– вызначаць паслядоўнасць, працягласць гістарычных падзей, з’яў, працэсаў;

– вызначаць у гістарычных тэкстах структуру гістарычнага часу (эпоха, перыяд, стагоддзе, год);

– вызначаць месцазнаходжанне вывучаемых гістарычных аб’ектаў, выяўляць змяненні на гістарычнай карце;

– характарызаваць гістарычныя падзеі, дзейнасць гістарычных асоб;

– характарызаваць палітычнае становішча краін;

– параўноўваць гістарычныя падзеі, з’явы па ўказаных крытэрыях;

– раскрываць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі, з’явамі, працэсамі;

– абагульняць гістарычныя факты, фармуляваць на іх аснове вывады;

– класіфікаваць і сістэматызаваць гістарычныя факты і паняцці;

– пераводзіць тэкставую інфармацыю ў знакава-сімвальную і наадварот;

– раскрываць значэнне гістарычных паняццяў;

– канкрэтызаваць гістарычныя паняцці.

Дасягненне мэты і выкананне задач факультатыва будзе садзейнічаць паспяховай здачы выпускнога экзамена па гісторыі Беларусі на ўзроўні агульнай базавай адукацыі.

## РЭКАМЕНДУЕМАЯ ЛІТАРАТУРА ДЛЯ НАСТАЎНІКА


1. Без-Корнилович, М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии: репринт. воспроизведение изд. 1855 г. – Минск, 1995.

2. Беларусь: народ, государство, время. – Минск, 2009.

3. Вішнеўскі, А. Ф., Юхо, Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах: са старажытных часоў да нашых дзён: вучэб. дапам.; пад агул. рэд. А. Ф. Вішнеўскага. — 2-е выд., дап. – Мінск, 2003.

4. Вяземский, Е. Е., Стрелова, О. Ю. Методические рекомендации учителю истории: основы профессионального мастерства: практ. пособие. – М., 2000.

5. Гарэцкі, М. Гісторыя беларускае літаратуры. – Мінск, 1992.

6. Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы / М. Біч, Р. Гарэцкі, У. Конан [і інш.]. — Мінск, 2007.

7. Гісторыя Беларусі: ад старажытных часоў – па 2008 г.; пад рэд. Я. К. Новіка. — Мінск, 2009.

8. Гісторыя Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. у дакументах і матэрыялах: хрэстаматыя; уклад., навук. рэд. А. Ф. Смалянчук. — Вільня, 2007.

9. Живописная Россия: отечество наше в его зем., ист., экон. и быт. значении: Литов. и Белорус. Полесье: репринт. воспроизведение изд. 1882 г. — 2-е изд. — Минск, 1994.

10. История Беларуси в документах и материалах; авт.-сост. И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец. — Минск, 2000.

11. Корзюк, А. А. Шляхі фарміравання пазнавальнага інтарэсу вучняў у працэсе вывучэння гісторыі Беларусі ў школе (канец XVIII – пачатак XX ст.): метад. дапам.; пад навук. рэд. І. І. Багдановіча. — Мінск, 2005.

12. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі. — Мінск, 2008.

13. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч.; пад рэд. М. П. Касцюка. — Мінск, 1994, 1995.

14. Паноў, С. В. Пазнавальныя задачы і заданні па гісторыі Беларусі: дыдактычны матэрыял для арганізацыі самастойнай працы вучняў у 8 класе. — Мінск, 1995.

15. Парашкоў, С. А. Гісторыя культуры Беларусі. — Мінск, 2003.

16. Шалькевіч, В. Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі. — Мінск, 2002.

17. Шоган, В. В. Методика преподавания истории в школе: уроки истории нового поколения. — Ростов н/Д, 2005.

18. Чигринов, П. И. Очерки истории Беларуси. — Мінск, 2006.

19. Эканамічная гісторыя Беларусі; пад агул. рэд. В. І. Галубовіча. — Мінск, 2005.

20. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. — Мінск, 1993–2003.

## РЭКАМЕНДУЕМАЯ ЛІТАРАТУРА ДЛЯ ВУЧНЯЎ

1. Атлас гісторыі Беларусі ад старажытнасці да нашых дзён: дадатак да 6-томнай «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі»» / аўтар тэкста Л. І. Языковіч; склад. Г. Р. Шыркунова, Л. У. Языковіч. — Мінск, 2004.

2. Бутрамееў, У. Вялікія і славутыя людзі беларускай зямлі. — 2-е выд. — Мінск, 1996.

3. Гісторыя Беларусі / А.Л. Абецэдарская [і інш.]; пад рэд. А. Г. Каханоўскага. — Мінск, 1997.

4. Гісторыя Беларусі (канец XVIII ст. — 1917 г.): кніга для чытання: 8-ы клас: дапам. для вучняў агульнаадукац. Устаноў; аўт.-склад. Н. Я. Новік. — Мінск, 2007.

5. Гісторыя Беларусі ў літаратурных вобразах (дакастрычніцкі перыяд); склад. М. Р. Гнеўка. — Мінск, 1979.

6. Гламбоцкі, П. М. Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. — 1917 г.: 8 клас: рабочы сшытак — 3-е выд. — Мінск, 2005.

7. Голубеў, В. Ф. Ці ведаеце вы гісторыю сваёй краіны / В. Ф. Голубеў, У. П. Крук, П. А. Лойка. — 2-е выд., 1995.

8. Иллюстрированная хронология истории Беларуси / авт.-составитель И. П. Ховратович. — Минск, 2000.

9. История Беларуси: словарь-справочник / И. Н. Кузнецов [и др.]; под ред. С.Ф. Дубенецкого. — Минск, 2000.

10. Казлоў, Л., Цітоў, А. Беларусь на сямі рубяжах. — Мінск, 1993.

11. Тарасаў, К. Памяць пра легенды: постаці беларус. мінуўшчыны. — 2-е выд., дап. — Мінск, 1993.

12. Хрестоматия по истории БССР: кн. для учащихся: в 2 ч. / сост. Е. М. Зуев, З. Ю. Копысский; под ред. И. С. Кравченко. — 3-е изд., перераб. — Минск, 1987. — Ч. 1.

13. 250 асоб з Беларусі ў дыялогах культур. — Мінск, 2008.

## ІНТЭРНЕТ-РЭСУРСЫ

| Назва партала, сайта | Электронны адрас |
|---|---|
| Адукацыйны партал Рэспублікі Беларусь | http://www.adu.by |
| Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі | http://history.by |
| Нацыянальная бібліятэка Беларусі | http://www.nlb.by |
| Архівы Беларусі | http://archives.gov.by |
| Энцыклапедыя «Вікіпедыя» | http://www.be.wikipedia.org |
| Асацыяцыя «Гісторыя і камп'ютар» | http://www.dcn-asu/internet/index.shtml |
| Свет гісторыі | http: //www. historia. ru/ |
| Віртуальны свет гісторыі | http: //history.machaon.ru/ |

| | |
|---|---|
| Віртуальны курс лекцый па гісторыі Беларусі | http://www.belarusianhistory.narod.ru |
| Адукацыйныя рэсурсы Интернета – гісторыя | http://www.alleng.ru/edu/hist3.htm |
| Беларускі гістарычны агляд | http://gw.lingvo.minsk.by |
| Беларускі краявід | http://www.kraj.org |
| Беларусіка-Albaruthenica | http://gw.lingvo.minsk.by/mab/@book/index.htm |
| Гісторыя Беларусі. Асобы | http://tbm.org.by |
| Глобус Беларусі | http://globus.tut.by |
| Збор помнікаў зямлі беларускай | http://www.radzima.org |
| Гісторыя Беларусі | http://albaruthenia.by |
| Мінск стары і новы | http://www.minsk-old-new.com |
| Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі | http://niab.belhost.by |
| Нацыянальны мастацкі музей Беларусі | http://www.artmuseum.by |
| Інтэрнет-праект «1812 г.» | http://www.museum.ru/museum/1812 |
| Музей гісторыі беларускай літаратуры | www.nacbibl.org.by/llitm/lithist |
| Портал "Музеи Беларуси" | http://www.museum.by |
| Сайты учреждений культуры Республики Беларусь | http://www.kultura.by/rus/sites/ |